РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

3 СТУДЗЕНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА

№ 1 (30389)

«СВОЙ ШЛЯХ РУХУ НАПЕРАД МЫ ВЫБІРАЕМ САМІ»

Навагодні зварот Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі да беларускага народа

Дарагія суайчыннікі і госці Беларусі!

Набліжаецца поўнач. Гэта імгненні, калі мы з хваляваннем сочым за стрэлкамі гадзінніка і здаецца, што час ляціць. А так шмат трэба паспець: падзякаваць адыходзячаму году за ўсё добрае, зазірнуць у будучыню, загадаць жаданні.

У навагоднюю ноч мы сустракаемся за адным сталом з роднымі, блізкімі, сябрамі, каб сказаць адзін аднаму цёплыя словы і падзякаваць за добрыя справы.

А ў пераднавагоднія хвіліны гэта традыцыя прыходзіць у Палац Незалежнасці. Мне вельмі прыемна павіншаваць вас, дарагія беларусы, з Новым годам і перадаць самыя шчырыя пажаданні ва ўсе куткі нашай краіны.

Дзякуй за лепшыя імгненні адыходзячага года. За радасць бачыць, як вы стваралі сем'і і станавіліся бацькамі. Як дачакаліся ўнукаў і праўнукаў. Як малышы пайшлі ў першы клас, а выпускнікі адкрылі дзверы ў дарослае жыццё, прадаўжаючы гісторыю сям'і і краіны.

Вядома, не ўсё і не заўсёды было так, як марылася. Але жыццё — як музыка. Яно гучыць рознымі нотамі, у рознай танальнасці. А ***мы заўсёды павінны настройвацца на лепшае, дапамагаючы адзін аднаму****.*

Дзякую за тое, што ў цяжкую гадзіну былі побач з тымі, хто меў патрэбу ў падтрымцы. За навагодняе свята, якое ў гэтыя дні вы дорыце нашым дзецям, адзінокім людзям і старым.

Нізкі паклон усім, хто аддае сябе рабоце з людзьмі: лечыць, вучыць, выхоўвае.

Нашы поспехі і дасягненні былі на карысць Радзімы.

Беларускія сяляне сабралі добры каравай — дастатковы, каб падзяліцца з сябрамі і суседзямі. Парадавалі навінкамі айчынныя вытворцы.

А наша родная Беларусь стала яшчэ больш утульнай і камфортнай. Гэта зрабілі вы — усе, хто праектуе, будуе, робіць наша жыццё ярчэйшым сваёй творчасцю. Прыгажосць і чысціня, якія так захапляюць прыезджых да нас гасцей, — наш іміджавы поспех, візітная картка. І гэта ваша заслуга.

Можа, мы і не заўсёды задумваемся аб каштоўнасці таго, што стала нормай, але дакладна ведаем: ***свой шлях руху наперад мы выбіраем самі.***

Дзякуй вам за палітычную мудрасць. Мы дастойна правялі адзіны дзень галасавання. Гэтак жа спакойна, без падказак і парад, сфарміравалі Усебеларускі народны сход. Гэта гістарычны крок, эфект ад якога давядзецца ўбачыць у дзеянні.

Яшчэ адной вяхой у гісторыі краіны стаў палёт першага касманаўта суверэннай Беларусі.

З такіх яркіх падзей і склалася аблічча адыходзячага года — стваральнага і цікавага. ***Мы ўпэўнена ішлі да сваіх мар і мэт, але галоўнае — пад чыстым небам.***

За мір і нашу бяспеку дзякуй людзям у пагонах і іх сем'ям, якія забяспечваюць надзейны тыл нашым абаронцам.

Фота БелТА.

З кожным годам гэтыя словы гучаць усё мацней і актуальней, а іх значэнне становіцца больш важкім. Як і ўдзячная памяць аб гераічным пакаленні Вялікай Айчыннай вайны.

У 80-годдзе Вялікай Перамогі для нас, наследнікаў пераможцаў, справа гонару захаваць завешчаны нам мір.

Дарагія беларусы!

Вось і 2024-ы становіцца гісторыяй. Нашай з вамі. Яна складзена з соцень тысяч успамінаў, але сюжэт заўсёды адзін: сумныя падзеі адыходзяць у мінулае, шчаслівыя — вядуць у будучыню.

Мы ведаем, што ўсё, чаго дасягнулі ў мінулым 2024 годзе, будзе мець працяг у надыходзячым 2025-м.

Наш шлях — пераемнасць.

Змена пакаленняў завершыцца ў бліжэйшыя гады. Па-беларуску мудра — з апорай на ўсё, чым мы даражым і чым ганарымся.

Наступная пяцігодка ў нашай краіне будзе пяцігодкай якасці. *Кожны яе год мы прысвецім аднаму важнейшаму напрамку.*

Пачнём з Года добраўпарадкавання краіны. Мэтай добраўпарадкавання нашай Беларусі стане павышэнне якасці жыцця людзей.

Зусім хутка нам давядзецца выбіраць будучыню дзяржавы. *Мы ўсе хочам, каб яна была паспяховай і шчаслівай. І абавязкова мірнай!*

Каб родныя і блізкія былі здаровыя, каб нас акружалі надзейныя сябры, добрыя і спагадлівыя людзі.

Надыходзіць час загадваць жаданні, і няхай усё задуманае здзейсніцца. Няхай наша родная Беларусь, моцная і незалежная, заўсёды будзе адзінай сям'ёй і домам для кожнага.

Я ганаруся вамі і шчаслівы быць выканаўцам вашай волі! Шчасця вам і дабра!

З Новым годам, беларусы!

З Новым годам нашых сяброў і ўсіх добрых людзей!

Міру вам і спакою!

НОВЫ ГОД ПАЧЫНАЕЦЦА З ВАЖНЫХ ЗМЕН 6–7

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

ЗА АКТЫЎНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ І ВЫДАТНЫЯ ДАСЯГНЕННІ

Прысуджаны прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецпрэміі Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва, а таксама прэмія «Беларускі спартыўны Алімп»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прысудзіў прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльныя прэміі дзеячам культуры і мастацтва. Адпаведныя ўказы кіраўнік дзяржавы падпісаў 31 снежня.

За актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, якая садзейнічае ўмацаванню духоўных каштоўнасцяў і маральных традыцый беларускага народа, патрыятычнаму выхаванню моладзі, ***па выніках 2024 года прысуджаны тры прэміі Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне».***

Калектыў Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі ўдастоены ўзнагароды за выдатныя дасягненні ў паляпшэнні якасці медыцынскай дапамогі, развіццё навукі і папулярызацыю ідэй дабрачыннасці і міласэрнасці, **калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў** — за актыўную дзейнасць у патрыятычным выхаванні моладзі і рэалізацыю праекта «Лінія памяці. Код вайны».

Протаіерэй Алег Кунцэвіч, настаяцель прыхода храма Узвіжання Крыжа Гасподняга ў Мінску, удастоены высокай узнагароды за вялікі асабісты ўклад у справу духоўнай асветы і патрыятычнае выхаванне, увекавечванне памяці аб загінулых у фашысцкім лагеры смерці для савецкіх ваеннапалонных «Шталаг 352».

СТАР. 3

«МЫ БУДЗЕМ УСЁ РАБІЦЬ ДЛЯ

Прэзідэнт пажадаў маленькім пацыентам сустракаць Новы год

Апошні ў 2024 годзе рабочы дзень Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі атрымаўся вельмі кранальным. Кіраўнік дзяржавы наведаў Мінскую абласную дзіцячую клінічную бальніцу і асабіста павіншаваў малых пацыентаў і іх бацькоў. Новы год яны сустракаюць не дома, а ў бальнічных сценах, таму ім вельмі патрэбныя цяпло і ўвага.

Фота БелТА.

«МЫ СТВАРЫЛІ ТУТ САМУЮ ПЕРАДАВУЮ БАЛЬНІЦУ»

Свята не перашкодзіла абмеркаваць і надзённыя пытанні з адказнымі асобамі. Кіраўніку дзяржавы далажылі ў цэлым аб стане спраў у дзіцячай абласной бальніцы. Галоўны ўрач установы Дзмітрый Зайцаў расказаў, што за год у бальніцы лечыцца каля 22 тысяч пацыентаў і выконваецца звыш 13 тысяч аператыўных умяшанняў. Працуе 219 урачоў. У Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы аказваюцца ўсе віды медыцынскай дапамогі. Большасць хірургічных умяшанняў выконваецца малаінвазійным шляхам: 98 % дзяцей аперыраваны лапараскапічна. У 2020 годзе з інавацыйнага фонду Прэзідэнта былі выдзелены грошы, на якія было закуплена самае сучаснае аперацыйнае абсталяванне. Дзякуючы гэтаму Мінская абласная дзіцячая клінічная бальніца па аснашчанасці аперацыйным абсталяваннем можа канкурыраваць з любой рэспубліканскай установай.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ўзровень бальніцы вельмі высокі, і пацікавіўся, ці дапамагае Мінская абласная дзіцячая клінічная бальніца іншым рэгіёнам. Міністр аховы здароўя запэўніў, што тут аказваецца медыцынская дапамога пацыентам з усіх абласцей, калі ўзнікае такая неабходнасць. «Мы стварылі тут самую перадавую бальніцу і аснасцілі прыстойна. Таму абавязкова павінны дапамагаць. Вобласць, зразумела, вялікая, але, калі звярнуліся людзі з іншай вобласці, адкідаць нельга. Гэта ж дзеці», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«КАЛІ ХВАРЭЕ ДЗІЦЯ — ГЭТА КАТАСТРОФА»

У аддзяленні анестэзіялогіі і рэанімацыі бальніцы нядаўна быў праведзены капітальны рамонт. Яго вынікі асабіста ацаніў Аляксандр Лукашэнка. Ён агледзеў рэанімацыйную залу, ізалятар для дзяцей старэйшага ўзросту, палаты сумеснага знаходжання дзяцей і іх бацькоў, палату для нованароджаных дзяцей. «Аддзяленне зрабілі, таму лячыце ўсіх, хто да вас звяртаецца. Асабліва дзетак», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы.

У палатах для нованароджаных, у палатах сумеснага знаходжання з бацькамі створаны ўсе ўмовы, каб і пацыентам было камфортна, і медыцынскі персанал мог пастаянна за імі назіраць. Карына Судноўская адзначыла, што створаны ўмовы і для таго, каб бацькам было зручна клапаціцца аб дзецях. «Гэта добрая справа», — адзначыў Прэзідэнт.

Таксама Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з работай педыятрычнага аддзялення № 1 для дзяцей з кардыялагічнай і рэўматалагічнай паталогіяй. Загадчыца аддзялення Святлана Клечан расказала, што за год тут пралячыліся 1200 пацыентаў. «Ці бывае так, што ў вас не хапае магчымасцяў, месцаў не хапае?» — спытаў кіраўнік дзяржавы. Медыкі запэўнілі, што такога не здараецца, дапамагаюць усім пацыентам, у тым ліку з іншых абласцей.

Аляксандр Лукашэнка завітаў у палату, у якой дзеці ляжаць са сваімі мамамі. Прэзідэнт прызнаўся, што сам вельмі хвалюецца, калі хварэюць дзеці. Ён падкрэсліў: вельмі добра, што ў бальніцы дзеці, якім таксама нялёгка, знаходзяцца разам з бацькамі.

Да маленькіх пацыентаў кіраўнік дзяржавы прыехаў не з пустымі рукамі, а з падарункамі. Дзеці таксама павіншавалі Прэзідэнта з Новым годам, пажадалі яму шчасця, здароўя і поспехаў у рабоце. «Калі ў мяне будуць поспехі ў рабоце, то ў вас таксама будуць», — пажартаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама пагутарыў з пацыентамі і іх бацькамі.

Сярод пацыентаў у свой час быў і Раман Кагадоўскі, які гераічна выратаваў свайго малодшага брата з пажару. А потым медыкі гераічна ратавалі самога хлопца. «Як сябе адчуваеш?» — спытаў Прэзідэнт. «Нармальна. Цяпер на абследаванне прыйшоў», — адказаў хлопец. Дактары адзначаюць, што для іх Раман — сапраўдны герой.

ПАВАЖАЮЧЫ АДЗІН АДНАГО І ВЫКОНВАЮЧЫ ПРАВАВЫЯ НОРМЫ:

Беларусь з 1 студзеня 2025 года ўжо трэці раз прымае старшынства ў органах Еўразійскага эканамічнага саюза.

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ў якасці старшыні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета накіраваў зварот кіраўнікам дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, які апублікаваны на афіцыйным сайце Прэзідэнта Беларусі.

«За мінулае дзесяцігоддзе наш саюз здолеў даказаць сур'ёзнасць ідэі цеснай эканамічнай інтэграцыі, сваю жыццяздольнасць і рэзультатыўнасць. Сумеснымі намаганнямі мы нарасцілі патэнцыял макраэканамічнай устойлівасці і мінімізавалі ўплыў негатыўных геапалітычных фактараў, — гаворыцца ў звароце. — 2025 год для Еўразійскага эканамічнага саюза будзе знакавым: завяршаецца пяцігодка рэалізацыі Стратэгічных напрамкаў развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі і закладваецца фундамент для старту новага этапу і ўвасаблення ў жыццё Дэкларацыі аб далейшым развіцці эканамічных працэсаў у рамках ЕАЭС да 2030 года і на перыяд да 2045 года «Еўразійскі эканамічны шлях».

У мэтах умацавання плённага інтэграцыйнага ўзаемадзеяння ў звароце прапануецца вызначыць асноўныя прыярытэты, якія павінны апынуцца ў цэнтры агульнай увагі ў гэтым годзе. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што паслядоўная рэалізацыя гэтых кірункаў будзе садзейнічаць далейшаму развіццю еўразійскай інтэграцыі і пашырэнню ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

ТЭХНАЛАГІЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ І КААПЕРАЦЫЯ

«Неабходна засяродзіць сумесныя намаганні на развіцці тэхналагічнага патэнцыялу дзяржаў — членаў ЕАЭС, фарміраванні агульнай прасторы кааперацыйнага ўзаемадзеяння ва ўсіх галінах эканомікі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У гэтых мэтах трэба актывізаваць рэалізацыю сумесных праектаў і праграм у сферах інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, штучнага інтэлекту, электратранспарту, мікраэлектронікі, робататэхнікі і новых матэрыялаў. «Супрацоўніцтва ў гэтым кірунку дасць магчымасць забяспечыць надзейную базу для развіцця партнёрскіх адносін паміж прадпрыемствамі дзяржаў — членаў ЕАЭС у мэтах стварэння новых імпартазамяшчальных вытворчасцяў, выпуску сумеснай прадукцыі пад еўразійскім брэндам», — заявіў беларускі лідар.

ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА

Для павышэння харчовай бяспекі саюза беларускі бок прапануе сканцэнтраваць намаганні на развіцці селекцыі і насенняводства, павышэнні генетычнага патэнцыялу племянной сельскагаспадарчай жывёлы.

АДЗІНАЯ ТРАНСПАРТНАЯ ПРАСТОРА І ЛАГІСТЫКА

Аляксандр Лукашэнка заявіў аб неабходнасці завяршыць фарміраванне адзінай транспартнай прасторы з рынкаццем роўных (недыскрымінацыйных) умоў і забеспячэннем справядлівай канкурэнцыі, асабліва пры ажыццяўленні паветраных перавозак паміж краінамі ЕАЭС.

Трэба прадоўжыць работу па адмене дазвольнай сістэмы на ўсе віды міжнародных аўтамабільных перавозак грузаў у трэція краіны і з іх.

«Уяўляецца асабліва важным ствараць новыя і ўдасканальваць дзеючыя лагістычныя ланцужкі бесперашкоднай дастаўкі грузаў, развіваць «бясшвовыя» і бяспечныя міжнародныя транспартныя калідоры, якія злучаюць дзяржавы — члены ЕАЭС», — гаворыцца ў звароце.

РОЎНЫЯ ЎМОВЫ І ПРАЗРЫСТАЯ КАНКУРЭНЦЫЯ

Асобную ўвагу Прэзідэнт Беларусі звярнуў на неабходнасць далейшай мэтанакіраванай работы па выраўноўванні ўмоў ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці, стварэнні агульнага і празрыстага канкурэнтнага асяроддзя на ўнутранай прасторы саюза.

«Пры гэтым ключавое значэнне мае рэзультатыўнае завяршэнне фарміравання агульных энергетычных рынкаў ЕАЭС», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

АБАРОНА ЎНУТРАНАГА РЫНКУ

У бягучых умовах беларускі бок бачыць неабходнасць прадоўжыць работу па абароне ўнутранага рынку. Такая дзейнасць павінна быць накіравана як на ўдасканаленне мытна-тарыфнага рэгулявання для выраўноўвання ўмоў гаспадарання ў ЕАЭС, так і на паўнацэнную абарону еўразійскага рынку ад небяспечнай прадукцыі.

«Важна забяспечыць прыняцце заснаваных на перадавой сусветнай практыцы і навуковай доказнай базе адзіных тэхнічных

ДЗЯЦЕЙ»

і ўсе святы дома

Дзеці таксама перадалі падарунак беларускаму лідару — жывую ёлку з упрыгажэннямі, зробленымі сваімі рукамі і падпісанымі цёплымі пажаданнямі. Ялінка, па словах Прэзідэнта, размесціцца ў Палацы Незалежнасці. Аляксандр Лукашэнка пажадаў малым пацыентам здароўя і будучы Новы год, як і ўсе святы, сустракаць дома. Не абышлося і без агульнага фота на памяць.

Прэзідэнт пагутарыў і з працоўным калектывам установы аховы здароўя. Найперш павіншаваў медыцынскіх супрацоўнікаў з Новым годам.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што калектыў Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы працуе ў добрых умовах. «Я думаў, вы доўга будавалі гэту бальніцу, але губернатар кажа, што за паўтара года ўсё зрабілі, — падкрэсліў ён. — Ну і добра. Цяпер будзем узводзіць паціху арэнднае жыллё. Будзем імкнуцца, каб вы на сваёй роднай зямлі працавалі, а не бегалі дзесьці па свеце ў пошуках лепшага жыцця».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка заўважыў: ён рады, што некаторыя з медыкаў, якія з'ехалі за мяжу, просяцца назад. «Я задаю пытанне: «Дык чаму ж?» — сказаў беларускі лідар. — Там і заробак, і ўсё... — «Не, не, такой аховы здароўя, як у Беларусі, няма». У комплексе, у цэлым. Але ў асноўным усе пасудамыйкамі працуюць, вобразна кажучы. І дзіўна, я думаў раней, што палякі — гэта нашы людзі, нашы родныя славяне, ніколі нашых людзей не пакрыўдзяць. А нічога падобнага. Гэта — палякі, а вы там усе — украінцы, і беларусы, і гэтак далей. Калі нехта хоча паспрабаваць — калі ласка. Не хацелася б, але глядзіце самі. Вы робіце сваё жыццё».

Кажучы аб мадэрнізацыі ўстановы аховы здароўя, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Мы будзем усё рабіць для дзяцей. Дзеці — гэта галоўнае. І, жадаючы вам усяго добрага ў новым годзе, я перш за ўсё хачу, каб вашы дзеткі ніколі не хварэлі». Здароўя беларускі лідар пажадаў і медыцынскаму персаналу.

Кіраўнік дзяржавы даручыў вызначыцца са статусам Бараўлян, прыняць адпаведнае рашэнне. «Трэба думаць, што нам тут рабіць: гэта будзе горад, вёска, гарадскі пасёлак ці нешта іншае? — удакладніў ён. — У наступным годзе ўносьце прапанову». Па яго словах, жыхары населенага пункта шмат разоў ставяць пытанне аб гэтым.

На развітанне Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што для яго вельмі важна было сустрэцца з калектывам і пацыентамі медустановы, праз іх перадаць віншаванні іх калегам, усім людзям Беларусі.

Валерыя СЦЯЦКО.
Вераніка КАНЮТА.

ЗА АКТЫЎНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ І ВЫДАТНЫЯ ДАСЯГНЕННІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

За выдатныя дасягненні ў галіне музычнага, манументальнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, навучання і выхавання творчай моладзі, якая атрымала грамадскае прызнанне, прысуджана восем спецыяльных прэмій Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва.

Высокай узнагароды ўдастоены калектывы:

Маладзёжнага тэатра эстрады — за значныя дасягненні ў галіне музычнага мастацтва, актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці краіны;

Гомельскага дзіцячага сацыяльнага пансіяната «Шчаслівыя ўсмешкі» — за развіццё творчага патэнцыялу дзяцей і маладых людзей з інваліднасцю, інтэграцыю інклюзіўнага мастацтва ў культурную прастору краіны;

Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў — за плённую працу ў галіне навучання і выхавання творчай моладзі, актыўную грамадска-патрыятычную дзейнасць;

Мінскага дзяржаўнага палаца дзяцей і моладзі — за значныя дасягненні ў патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення, арганізацыю работы Паста № 1 горада-героя Мінска па нясенні Ганаровай вахты памяці.

За ўнёсак у рэканструкцыю мемарыяльнага комплексу ў памяць пра вязняў Азарыцкага лагера смерці ў Калінкавіцкім раёне Гомельскай вобласці спецыяльнай прэміяй адзначаны **аўтарскі калектыў у складзе начальніка бюро галоўных інжынераў праекта ААТ па комплексным праектаванні аб'ектаў жыллёва-грамадзянскага прызначэння «Інстытут Гомельграмадзянпраект» Вольгі Ачапоўскай, загадчыка навукова-асветніцкага аддзела Гомельскага абласнога музея ваеннай славы Віктарыі Заяц і загадчыка філіяла «Мемарыяльны комплекс вязням Азарыцкага лагера смерці» Калінкавіцкага краязнаўчага музея Зінаіды Хлебавец.**

За рэалізацыю міжнароднага маладзёжнага патрыятычнага праекта «Дарогамі памяці і славы» высокай узнагароды ўдастоены **Магілёўская абласная арганізацыя БРСМ, тэлерадыёкампанія «Магілёў» і Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава.**

Спецыяльныя прэміі таксама прысуджаны **загадчыку аддзела традыцыйнай культуры Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці Таццяне Лапковай** — за асабісты ўнёсак у захаванне і папулярызацыю тэхналогіі аплятання берастой ганчарнага посуду — і **майстру народных мастацкіх рамёстваў Гродзенскага раённага Культурна-інфармацыйнага цэнтра Ірыне Шавельскай** — за значны ўклад у захаванне і папулярызацыю традыцыйных рамёстваў, адраджэнне народных тэхналогій саломапляцення.

Кіраўнік дзяржавы таксама падпісаў указ аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп» 2024 года.

За значны ўнёсак у развіццё фізічнай культуры і спорту, актыўную дзейнасць па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, развіцці фізкультурна-спартыўных традыцый, якія садзейнічаюць фарміраванню гарманічнай асобы, спецыяльная прэмія прысуджана:

Заслужанаму трэнеру Беларусі, старшаму трэнеру нацыянальнай каманды па інваспорце РЦАП па паралімпійскіх і дэфлімпійскіх відах спорту Генадзю Вішнякову, які падрыхтаваў 21-разовага паралімпійскага чэмпіёна Ігара Бокага, іншых пераможцаў і прызёраў Паралімпійскіх гульняў;

Заслужанаму майстру спорту Беларусі па вольнай барацьбе Ірыне Курачкінай, сярэбранаму прызёру Алімпійскіх гульняў 2021 года, бронзаваму прызёру чэмпіянатаў свету 2017, 2019, 2024 гадоў. Яна заваявала ліцэнзію на ўдзел у Алімпійскіх гульнях 2024 года, але дапушчана да іх не была. У цяперашні час спартсменка займае 3-е месца ў сусветным рэйтынгу ў катэгорыі да 55 кг;

Калектыву Віцебскай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву № 1, якая з'яўляецца адной з асноўных баз для падрыхтоўкі спартсменаў у скачках на батуце. У гэтым відзе спорту выхаванцамі школы заваявана тры алімпійскія залаты.

Аляксандр Лукашэнка абазначыў прыярытэты Беларусі падчас старшынства ў ЕАЭС

патрабаванняў, гарманізацыю нацыянальных стандартаў і пераход на прымяненне міждзяржаўных стандартаў. Неабходна стварыць кантралюемыя ўмовы доступу імпартных тавараў на ўнутраны рынак, прадоўжыць эфектыўнае прымяненне сістэмы кіравання рызыкамі пры вызначэнні мытнага кошту тавараў», — гаворыцца ў дакуменце.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у існуючых эканамічных рэаліях своечасовым можа стаць стварэнне ў ЕАЭС уласнай біржавой сістэмы індыкатараў таварных рынкаў на ключавыя тавары (нафтапрадукты, сельгаспрадукцыя, лесапрадукцыя, будматэрыялы і іншае) на базе інфармацыйных, метадалагічных і тэхналагічных платформ краін саюза.

«Патрэбны стымул для далейшага развіцця біржавога гандлю і фарміравання канкурэнтных цэн на тавары», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

ЛІЧБАВАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ

Яшчэ адзін прыярытэт датычыцца галіны лічбавай трансфармацыі, дзе патрабуецца актывізацыя ўзаемадзеяння дзяржаў — членаў ЕАЭС.

«У сучасным свеце ўзровень развіцця лічбавых тэхналогій адыгрывае вызначальную ролю ў канкурэнтаздольнасці краін. Адной з найважнейшых задач стане ўстараненне існуючых лічбавых бар'ераў. Мяркуем, што праведзеная работа дасць магчымасць дасягнуць сінергетычнага эфекту ў развіцці эканомік дзяржаў-членаў і лічбавай прасторы ЕАЭС», — заявіў беларускі лідар.

Для павышэння эфектыўнасці сістэмы дзяржаўных закупак прапануецца канчаткова ўрэгуляваць пытанне аб узаемным прызнанні электроннага лічбавага подпісу дзяржаў — членаў саюза і садзейнічаць далейшаму прасоўванню лічбавых інструментаў у гэтай сферы.

«У сувязі з актыўным развіццём электроннага гандлю ўзнікае неабходнасць асобнага рэгулявання ў саюзе дзейнасці маркетплейсаў разам з пошукам аптымальнай мадэлі для ўліку інтарэсаў як дзяржавы, так і электронных гандлёвых пляцовак, прадаўцоў і спажыўцоў», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Новы імпульс патрэбны і для развіцця міжнароднага супрацоўніцтва ва ўсіх яго фарматах, стварэння дадатковых умоў для прасоўвання тавараў саюза на замежныя рынкі.

«Узаемадзеянне дзяржаў-членаў з роднаснымі па сваіх статутных мэтах і ідэалогіі рэгіянальнымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі, а таксама развіццё партнёрства ў рамках інстытута дзяржавы — назіральніка пры ЕАЭС — важны фактар умацавання эканамічнага патэнцыялу саюза. Асаблівая ўвага павінна ўдзяляцца практычным аспектам спалучэння інтэграцыйных патэнцыялаў ЕАЭС, СНД, ШАС і БРІКС, развіццю гандлёва-эканамічных адносін з дзяржавамі — удзельніцамі АСЕАН», — падкрэсліў беларускі лідар.

Далейшую работу па рэалізацыі падпісаных на ўзроўні ЕАЭС пагадненняў аб свабодным гандлі і гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве з дружалюбнымі краінамі, актывізацыю перагавораў з перспектыўнымі партнёрамі беларускі бок лічыць ключавымі практычнымі элементамі пазіцыянавання саюза як міжнароднай рэгіянальнай арганізацыі, якая паспяхова функцыянуе на Еўразійскім кантыненце.

САЦЫЯЛЬНАЯ І ГУМАНІТАРНАЯ ТЭМЫ

Не менш важнай з'яўляецца сумесная работа ў сацыяльнай і гуманітарнай сферах.

«Відавочна, што далейшае развіццё ЕАЭС павінна быць непарыўна звязана з павышэннем дабрабыту грамадзян дзяржаў — членаў саюза. У сувязі з гэтым у полі нашай больш пільнай увагі павінна знаходзіцца супрацоўніцтва ў сферы аховы здароўя, адукацыі, спорту, турызму, культуры, у іншых гуманітарных сферах», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ

Паводле слоў Прэзідэнта, як ніколі раней ад краін ЕАЭС патрабуецца пераход на новы ўзровень інфармацыйнага ўзаемадзеяння для прыняцця эфектыўных мер супраць розных дэструктыўных рэсурсаў, агрэсіўных выпадаў.

«Уяўляецца мэтазгоднай распрацоўка кансалідаванага падыходу да фарміравання агульнай інфармацыйнай прасторы на аснове павагі традыцыйных каштоўнасцяў нашых краін, гістарычнай і культурнай спадчыны народаў», — заявіў ён.

«І, безумоўна, мы павінны годна адзначыць асаблівую дату ў нашай агульнай гісторыі — 80-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, аб'яднаць намаганні, накіраваныя на забеспячэнне міру і барацьбу з нацызмам, які зноў становіцца пагрозай для ўсяго чалавецтва, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Сёння важна дэманстраваць сусветнай супольнасці, што, толькі паважаючы адзін аднаго і выконваючы прававыя нормы, магчыма развівацца, ствараць будучыню, дасягаць дабрабыту».

Мірнага неба над галавой!

80 гадоў Вялікай Перамогі

2025

ЗВЯЗДА

Фота БелТА.

Студзень

Пн	Аўт	Ср	Чц	Пт	Сб	Нд
		1	2	3	4	5
6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19
20	21	22	23	24	25	26
27	28	29	30	31		

Люты

Пн	Аўт	Ср	Чц	Пт	Сб	Нд
					1	2
3	4	5	6	7	8	9
10	11	12	13	14	15	16
17	18	19	20	21	22	23
24	25	26	27	28		

Сакавік

Пн	Аўт	Ср	Чц	Пт	Сб	Нд
					1	2
3	4	5	6	7	8	9
10	11	12	13	14	15	16
17	18	19	20	21	22	23
24	25	26	27	28	29	30
31						

Красавік

Пн	Аўт	Ср	Чц	Пт	Сб	Нд
	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28	29	30				

Май

Пн	Аўт	Ср	Чц	Пт	Сб	Нд
			1	2	3	4
5	6	7	8	9	10	11
12	13	14	15	16	17	18
19	20	21	22	23	24	25
26	27	28	29	30	31	

Чэрвень

Пн	Аўт	Ср	Чц	Пт	Сб	Нд
						1
2	3	4	5	6	7	8
9	10	11	12	13	14	15
16	17	18	19	20	21	22
23	24	25	26	27	28	29
30						

Ліпень

Пн	Аўт	Ср	Чц	Пт	Сб	Нд
	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28	29	30	31			

Жнівень

Пн	Аўт	Ср	Чц	Пт	Сб	Нд
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	31

Верасень

Пн	Аўт	Ср	Чц	Пт	Сб	Нд
1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28
29	30					

Кастрычнік

Пн	Аўт	Ср	Чц	Пт	Сб	Нд
		1	2	3	4	5
6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19
20	21	22	23	24	25	26
27	28	29	30	31		

Лістапад

Пн	Аўт	Ср	Чц	Пт	Сб	Нд
					1	2
3	4	5	6	7	8	9
10	11	12	13	14	15	16
17	18	19	20	21	22	23
24	25	26	27	28	29	30

Снежань

Пн	Аўт	Ср	Чц	Пт	Сб	Нд
1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28
29	30	31				

У НОВЫ ГОД З ДОБРЫМІ

Вырастуць заробкі і пенсіі, павялічыцца памер
Што яшчэ чакае беларусаў у 2025-м?

Традыцыйна Новы год пачынаецца для жыхароў краіны з важных змен. І 2025-ы не выключэнне. Сёлета навацыі закрануць як дабрабыт грамадзян розных узростаў, так і працоўныя адносіны і абыходжанне з жывёламі. Пра самыя адметныя змены — у нашым дайджэсце.

ВЫРАСЦЕ «МІНІМАЛКА»

З 1 студзеня мінімальная зарплата ў Беларусі вырасце без малога на 100 рублёў, альбо на 16 %, у параўнанні з нарматывам, які дзейнічаў у 2024 годзе. Па інфармацыі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, «мінімалка» ў новым годзе дасягне **726 рублёў**. Нагадаем, мінімальная

зарплата ў нашай краіне — найніжэйшы парог аплаты працы. Прытрымлівацца гэтай велічыні пры аплаце працы работнікаў абавязаны ўсе без выключэння наймальнікі: суб'екты гаспадарання дзяржаўнай і прыватнай формаў уласнасці, ІП; супрацоўнікі, з якімі заключаны працоўны дагавор. Пры гэтым у калектыўным дагаворы можа быць прапісаны больш высокі памер «мінімалкі». Галоўнае, каб не ніжэйшы.

СТАЎКА Ў РОСТ

І яшчэ пра заробкі. Базавая стаўка для аплаты працы ў бюджэтнай сферы з 1 студзеня складае **270 рублёў**. Дагэтуль яе памер складаў 253 рублі. Апошні раз яе павялічвалі 1 верасня 2024 года. Тады яна вырасла на 6,7 %.

Нагадаем, базавая стаўка — гэта асноўны элемент тарыфнай сістэмы, на аснове якой праводзіцца аплата працы работнікаў бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, што атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый.

У цэлым, як паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, зарплата работнікаў бюджэтнай сферы за 2025 год павінна вырасці на **15 %**.

ДАДАТКОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Акрамя таго, з наступнага года бюджэтнікі змогуць працаваць больш і атрымліваць за гэта даплату, што прадугледжана нормамі адпаведнага ўказа Прэзідэнта. Дадатковыя абавязкі ў работніка могуць з'явіцца, толькі калі ён згодзен на такую схему. Даплата можа скласці да 100 працэнтаў зарплаты, але дакладны памер будзе вызначацца з улікам аб'ёмаў выкананай работы. Кіраўнікі бюджэтных арганізацый змогуць па ўзгадненні з прафсаюзам зацвярджаць штатную колькасць работнікаў у меншай колькасці, чым гэта вызначана нарматывамі. Такім чынам, увесь фонд зарплаты можна будзе дзяліць на меншую колькасць работнікаў, і яны змогуць атрымаць прыбаўку.

БАЗАВЫ ПАДЫХОД

З 1 студзеня на два рублі павялічылася базавая велічыня. Цяпер яна складае **42 рублі**. Мінулы раз яна таксама мянялася з 1 студзеня. Гэты паказчык выкарыстоўваюць у якасці асновы для разліку цэлага шэрагу выплат — дапамог, стыпендый, а таксама вызначэння памераў падаткаў, збораў, штрафаў і розных пошлін. Пры гэтым стане большай дапамога па беспрацоўі. Гэта, дарэчы, адна з нямногіх выплат у Беларусі, памер якой прывязаны да базавай велічыні, а не да бюджэту пражытачнага мінімуму. Нагадаем, права на яе маюць тыя, хто быў звольнены па

ўважлівай прычыне. Грашовая дапамога рэгулярна выплачваецца дзяржавай асобам, якія маюць статус беспрацоўных. Яе памер залежыць ад часу, які грамадзянін правёў без працы: максімальны — дзве базавыя велічыні, мінімальны — 70 % базавай велічыні.

ПРАЦАВАЦЬ ВЫГАДНА

Добрая навіна для пенсіянераў, якія працягваюць працаваць. З 1 студзеня знята абмежаванне па памеры іх пенсій. Напрыклад, чалавек выйшаў на пенсію з каэфіцыентам 1,45. Згодна з заканадаўствам, да гэтага ён мог атрымліваць пенсію, працягваючы працаваць, з каэфіцыентам не больш за 1,3. Пачынаючы з 2025 года пенсія будзе поўнасцю выплачвацца, калі чалавек пенсіённага ўзросту працягвае працаваць. У некаторых пенсіянераў пенсіі вырастуць. Пры гэтым сума, якую недаатрымліваў работнік, у кожнага свая. У некаторых яна можа даходзіць нават да 500 рублёў. Для перараразліку пенсіі не трэба кудысьці звяртацца. Мера, звязаная са зняццем абмежавання памеру пенсіі, будзе рэалізавана ў аўтаматычным рэжыме.

У цэлым жа пенсія за 2025 год павінна вырасці, паведаміла **міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА:**

— З улікам прагнозных параметраў і разлікаў плануем, што ў сярэднім за год пенсія павялічыцца на **14 %**. Яе сярэдні памер за год складзе **926 рублёў**.

Наталля Паўлючэнка адзначыла, што прадугледжваецца паэтапнае павышэнне пенсіі, будуць павялічвацца надбаўкі, даплаты да пенсій у выніку росту бюджэту пражытачнага мінімуму, з якога яны разлічваюцца.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2
Продавец	ОАО «Слонимский агросервис», 231800, Гродненская обл., г. Слоним, ул. Строителей, 8
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов (одним лотом).
Месторасположение – Гродненская обл., Слонимский р-н, д. Чемеры, ул. Грибовская и Озгиновичский с/с, 27, вблизи д. Чемеры

Производственная база в составе:
гаражи (здания специализированные автомобильного транспорта, инв. № 450/С-14806 – 404 кв. м и инв. № 450/С-14814 – 396,8 кв. м);
административное здание (здание административно-хозяйственное, инв. № 450/С-12729, 467,2 кв. м, составные части: двое ворот, забор, два покрытия);
здания нежилые (здания неустановленного назначения, инв. № 450/С-14624 – 518,4 кв. м и инв. № 450/С-14772 – 363 кв. м);
контрольно-диспетчерский пункт (здание специализированное иного назначения, инв. № 450/С-12762, 359,5 кв. м, составные части: навес).
Обременение: помещения зданий частично сданы в аренду

Начальная цена лота с НДС 20 % – 263 400,00 бел. руб.
Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота

Сведения о земельных участках:
1) общ. пл. 0,6852 га с кадастровым номером 425483307102000025, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений;
2) общ. пл. 0,3534 га с кадастровым номером 425483307102000326, предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания административного здания.
Ограничения (обременения) прав на земельные участки: расположены в водоохранных зонах рек и водоемов

Задаток 10 % от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **4 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
с 11.00 до 12.00 05.02.2025.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок:
Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 04.02.2025 до 17.00**
на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 17-310-36-37, +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Информация о проведении открытого аукциона 06 февраля 2025 г. на право аренды земельного участка

Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125.

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Срок аренды	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	Минская область, Смолевичский район, в районе г. Смолевичи	624800000001003803	0,8497	Для строительства и обслуживания производственной базы	99 лет	11 874,56
2	Минская область, Смолевичский район, в районе д. Дуброва	624800000001001150	7,1334	Для строительства коттеджного комплекса	99 лет	185 468,40
3	Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, д. Сосновая, ул. Придорожная, 31Б	624883010101000674	0,4004	Для строительства и обслуживания общественно-торгового центра	99 лет	31 741,71
4	Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, д. Ляды, ул. Весенняя, 9А	624883005801000177	0,0738	Для строительства и обслуживания магазина и подъездной дороги к нему	99 лет	3 634,49
5	Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, 33Б, вблизи д. Динаровка	624883000018000393	0,7416	Для строительства и обслуживания административно-складских зданий и сооружений	99 лет	32 051,90

Аукцион состоится **06 февраля 2025 г. в 15.00** в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: *г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125*, зал заседаний.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу **https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/,** Смолевичского райисполкома **isp@smolevichi.gov.by,** на сайте Минского областного исполнительного комитета.

УНП 6000014139

НАВІНАМІ

дапамогі дзецям...

ПАДТРЫМКА ДЗЯЦЕЙ І МАЦІ

З 1 студзеня 2025 года выраслі некаторыя выплаты па цяжарнасці і родах, а таксама дапамогі па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў. У прыватнасці, прыкметна вырас мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах для працуючых жанчын без шасці месяцаў страхавога стажу. Дагэтуль яны атрымлівалі палову ад бюджэту пражытачнага мінімуму. З 2025 года гэта дапамога будзе раўняцца мінімальнай зарплаце. Нагадаем, з 1 студзеня мінімалка складзе **726 рублёў** у месяц.

Змяненні закранулі і беспрацоўных будучых маці, якія стаяць на ўліку ў органах занятасці. Дагэтуль яны атрымлівалі дапамогу ў памеры паловы БПМ. Па новых правілах калі будучая маці была звольнена не пазней як за шэсць месяцаў да назначэння дапамогі, то яна стане атрымліваць 100 % БПМ.

Дапамога па доглядзе за хворым дзіцем да 14 гадоў або дзіцем-інвалідам таксама павялічыцца. З 2025 года яна дасягне мінімальнай зарплаты.

ДАПАМОГА РУБЛЁМ

З новага года павялічацца і выплаты пры нараджэнні дзіцяці. Як патлумачылі ў Мінпрацы, пры нараджэнні першага дзіцяці аднаразовая дапамога складзе **4378 рублёў**. Плюс **437,8 рубля** складзе аднаразовая дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці.

Пры нараджэнні другога дзіцяці аднаразовая дапамога складзе **6129,2 рубля і 437,8 рубля** складзе дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці.

Пры нараджэнні трэцяга і наступных дзяцей аднаразовая дапамога дасягне **6129,2 рубля і 437,8 рубля** складзе аднаразовая дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці. І таксама неабходна не забываць пра прызначэнне сямейнага капіталу. А гэта каля 31,5 тысячы рублёў.

ЗНАЧНАЯ ПАДТРЫМКА

З новага года ў Беларусі прадугледжаны навацыі, накіраваныя на матэрыяльную падтрымку некаторых катэгорый грамадзян. Так, з 2025 года павышаны ўзровень матэрыяльнай падтрымкі дзяцей-інвалідаў. У прыватнасці, дзецям-інвалідам у выпадку смерці аднаго з бацькоў устанаўліваецца дадатковае павышэнне да пенсіі. У залежнасці ад ступені страты здароўя павышэнне складзе ад 80 да 110 % бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.

Таксама прадастаўлена права на датэрміновую пенсію па ўзросце татам дзяцей-інвалідаў, якія выхавалі дзіця без маці. Да гэтага падобная пенсія бацьку прызначалася, толькі калі маці дзіцяці атрымала права на гэту пенсію і адмовілася ад яе на карысць бацькі ці не паспела скарыстацца сваім правам праз смерць.

Іншая навацыя заключаецца ў тым, што датэрміновую пенсію замест маці прызначаць бацьку пры дасягненні ім узросту 58 гадоў пры ўмове, што пацвярджаны факт выхавання дзіцяці-інваліда не менш як восем гадоў да яго паўналецця і стаж работы не менш як 25 гадоў, з якіх на працягу не менш пяці гадоў выплачваліся страхавыя ўзносы.

Адна з найбольш чаканых норм звязана з выплатай дапамогі на старэйшых за тры гады дзяцей у сям'і, дзе дзіця-інвалід дасягнула 18-гадовага ўзросту. Калі яму будзе ўстаноўлена I група інваліднасці з прадаўжэннем догляду, сям'я будзе атрымліваць дапамогу на іншых дзяцей, якія не дасягнулі паўналецця.

СЯМЕЙНЫ КАПІТАЛ

З 1 студзеня 2025 года з'явілася магчымасць датэрмінова выкарыстоўваць сямейны капітал пры ўзвядзенні жылля ў шматкватэрных жылых дамах самастойна без накіравання мясцовага органа ўлады. Таксама сродкі сямейнага капіталу могуць быць выкарыстаны датэрмінова на пагашэнне крэдытаў, выдзеленых на будаўніцтва жылля, незалежна ад віду крэдыту і даты заключэння крэдытнага дагавора (у тым ліку раней за 2015 год).

— Наяўнасць ва ўласнасці жылля вызначаецца на дату заключэння крэдытнага дагавора па складзе сям'і, які ўлічваецца на дату звароту па датэрміновае распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу, — адзначылі ў Мінпрацы.

НОВЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ЎЛАДАЛЬНІКАЎ ЖЫВЁЛ

З новага года пачалі дзейнічаць новыя патрабаванні да ўладальнікаў жывёл. Яны прадугледжаны Законам «Аб адказным абыходжанні з жывёламі». У прыватнасці, павышаныя патрабаванні будуць прад'яўляцца да ўтрымання сабак небяспечных парод. Іх уладальнікі абавязаны прайсці спецыяльныя курсы і атрымаць пасведчанне. Згодна з новымі правіламі, уладальнікі хатніх жывёл атрымаюць права на чыпіраванне сваіх гадаванцаў. Устанаўліваецца механізм часовага абмежавання права ўласнасці на жывёлу і яе канфіскацыі за парушэнне ўладальнікам умоў абыходжання з жывёлай, што пацягнула прычыненне шкоды здароўю грамадзян, жывёл або маёмасці.

Валянцін ПАЎЛОВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» 04 февраля 2025 в 14.00 проводит торги по продаже следующих объектов

№ п/п	Наименование объекта продажи, технические и эксплуатационные характеристики	Начальная цена продажи составляет без учета НДС, белорусских рублей	Задаток, белорусских рублей
Лот № 1	Капитальное строение с инвентарным номером 722/С-254 площадью 37,4 кв. м, наименование – здание административное, назначение – здание административно-хозяйственное, составные части и принадлежности: сборно-щитовое обложенное кирпичом здание, расположенное по адресу: Могилевская область, Круглянский район, г. Круглое, ул. Могилевская, 25	200 000,00 (двести тысяч рублей 00 копеек)	20 000,00 (двадцать тысяч рублей 00 копеек)
	Капитальное строение с инвентарным номером 722/С-258 площадью 125,0 кв. м, наименование – производственный корпус, назначение – здание нежилое, составные части и принадлежности: крупнопанельный производственный корпус, расположенное по адресу: Могилевская область, Круглянский район, г. Круглое, ул. Могилевская, 25		
	Капитальное строение с инвентарным номером 722/С-7240 протяженностью 38,1 м. п., наименование – водопроводные сети наружные, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, составные части и принадлежности: А-Участок водопроводной сети, расположенное по адресу: Могилевская область, Круглянский район, г. Круглое, 32, водопроводная сеть		
	Капитальное строение с инвентарным номером 722/С-7239 протяженностью 36,5 м. п., наименование – канализационные сети наружные, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности: А-Участок канализационной сети, расположенное по адресу: Могилевская область, Круглянский район, г. Круглое, 32, канализационная сеть		

Собственник имущества:
СМУ № 6 ОАО «БЕЛСЕЛЬЭЛЕКТРОСЕТЬСТРОЙ» 212012, Республика Беларусь, г. Могилев, ул. Челюскинцев, 174, УНП 100120777, тел. +375222646658, тел. для осмотра объектов продажи +375291696851.

Организатор торгов: унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

Место проведения торгов: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Условие проведения торгов – победителем торгов (покупателем) возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в сумме 2196,00 (Две тысячи сто девяносто шесть белорусских рублей 00 копеек).

Лот № 1 продается на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком.

Задаток перечисляется на расчетный счет унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП»: № BY88ALFA30122641790010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Могилев, BIC: ALFABY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет сайте организатора по адресу: www.mogilev.cci.by.

Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) – в течение 10 рабочих дней после проведения торгов.

Срок оплаты предмета торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся 04 февраля 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 09.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112.

Последний срок подачи заявления – **03 февраля 2025 г. до 12.00.**

Регистрация участников торгов **04 февраля 2025 г.** с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: **(0222) 778032, +375 44 735 00 30** – Жилина Ольга Александровна.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона, оператор ЭТП:
ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by, iintorgi.by

Продавец:
ЗАО «Мальва-проспект», 223028, Минская обл., Минский р-н, с/с Ждановичский, аг. Ждановичи, ул. Линейная, д. 3, каб. 303

№	Наименование	Начальная цена, без НДС
1	**Капитальное строение (магазин «Цветы»),** расположенное по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, 90, общ. пл. 192,5 кв. м	300 000,00 долл. США в эквиваленте по курсу НБ РБ на день проведения торгов

Аукцион состоится 14.01.2025 (начало: 10.00, окончание: 16.00) на электронной торговой площадке iintorgi.by.
Время приема заявок:
с 03.01.2025 09.00 до 13.01.2025 г. 16.00.
Иные сведения о порядке проведения, в том числе об оформлении участия в торгах, определении лица, выигравшего торги, опубликованы на сайте ЭТП и в ранее опубликованном извещении о проведении публичных торгов в форме электронного аукциона в газете «Звязда» № 244 от 14.12.2024 (30378), стр. 11

Контакты: тел.: +375 17-300-90-03, +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by

СВЯТКАВАЛІ ЎСЕЙ КРАІНАЙ

НАВОГОДНІ НАСТРОЙ БЕЛАРУСІ

Фота БелТА і Сяргея ПЯТРОВА.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

НАДВОР'Е

ДА ВЫХАДНЫХ ЗІМА ПАКАЖА СВОЙ ХАРАКТАР

А ноччу будзе па-сапраўднаму марозна

У снежні мы белага ды пухнатага снегу і не бачылі. Мокры снег-пяціхвілінка і не больш за тое. А вось з першых дзён новага года зіма вырашыла паказаць нам майстар-клас: да нас у госці зазірне вецер з Арктыкі, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У першую пятніцу года надвор'е ў Беларусі будзе вызначаць халодная няўстойлівая паветраная маса. Воблачна з праясненнямі. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу, які будзе пераходзіць у мокры снег і снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер заходні, паўднёва-заходні ўмераны, месцамі парывісты, уначы месцамі на ўсходзе моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад нуля да мінус 6 градусаў, удзень будзе ад 2 цяпла да 3 марозу. Атмасферны ціск ноччу будзе расці, днём істотна не зменіцца.

Надвор'е пачне мяняцца ўжо ў суботу. На большай частцы тэрыторыі краіны чакаецца кароткачасовы снег. Месцамі мяцеліца, на дарогах галалёдзіца. Вецер заходні, паўночна-заходні парывісты, у многіх раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 2 градусаў да 7 марозу, днём крыху цяплей, але ўсё ж ад нуля да мінус 4 градусаў.

У нядзелю да нас прыйдзе вецер з поўначы і ўмовы надвор'я будуць фарміраваць малаактыўныя франтальныя раздзелы і паветраныя масы арктычнага паходжання. Воблачна з праясненнямі. Ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер заходні, паўднёва-заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы да 2–9 марозу, ды і днём будзе ад нуля да мінус 5 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 3820000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 662. Індэкс 63850. Зак. № 73.

Нумар падпісаны ў 19.30 2 студзеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12